ТРАВЕНЬ – ЖНІВЕНЬ 2025
TRENDS.BELHELCOM.ORG

# ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ: АСНОЎНЫЯ ТРЭНДЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАЛІТЫКІ

АГУЛЬНЫЯ МЕРЫ | ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНАЯ ПРАКТЫКА | КЛЮЧАВЫЯ РЭАКЦЫІ МІЖНАРОДНЫХ СТРУКТУР



Мы ў БХК стараемся прытрымлівацца «work-life balance», але ў нашых умовах гэта нерэалістычна. Часта мы мімаволі «нясем» працу дадому, і ўся сям'я апынаецца ў курсе сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі.

Паколькі ўсе ў так ужо ўцягнутыя ў гэты кантэкст, мы папрасілі нашых дзяцей намаляваць свае асацыяцыі са словамі «свабода» і «забарона». У 2025 годзе мы зрабілі вокладкі трэндаў на аснове гэтых малюнкаў

На гэтай вокладцы - малюнак N, 16 гадоў.

БЕЛАРУСКІ
ХЕЛЬСІНКСКІ
КАМІТЭТ

© Беларускі Хельсінкскі Камітэт, 2025

# ЗМЕСТ


УВОДЗІНЫ 5

РЭЗЮМЭ 7

I. АГУЛЬНЫЯ МЕРЫ: ЗАКАНАДАЎСТВА, СТРАТЭГІІ, ПАЛІТЫКІ, ЯКІЯ Ў ЦЭЛЫМ ВЫЗНАЧАЮЦЬ УМОВЫ І ПЕРАДПАСЫЛКІ ДЛЯ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА Ў КРАІНЕ 11

Пашырэнне легалізацыі сістэмных рэпрэсій 11

Фармалізацыя дыскрымінацыі па прыкметах сэксуальнай арыентацы, гендэрнай ідэнтычнасці і рэпрадуктыўнага выбару 17

Вырашэнне пытанняў недахопа грашовых рэсурсаў і адтоку чалавечага капіталу праз парушэнне эканамічных і сацыяльных правоў 18

Узмацненне ціску ў сферы адукацыі: абмежаванне адукацыйных правоў і мілітарызацыя 20

II. ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНАЯ ПРАКТЫКА: ПАРУШЭННІ ГРАМАДЗЯНСКІХ, ПАЛІТЫЧНЫХ, САЦЫЯЛЬНЫХ, ЭКАНАМІЧНЫХ І КУЛЬТУРНЫХ ПРАВОЎ 23

Новыя формы ціску на “асоб, якія не задзейнічаныя ў эканоміцы” (“дармаедаў”) 23

Актывізацыя паседжанняў судоў напярэдадні заканчэння тэрмінаў даўнасці 24

Узмацненне кантроля і ідэалагізацыі ў сферы адукацыі 24

Новыя формы трансгранічнага пераследу і ціску на сваякоў тых, хто вымушана з’ехаў 25

Новыя формы ціску на працоўных месцах 25

**III. КЛЮЧАВЫЯ ЗМЕНЫ У РЭАКЦЫЯХ МІЖНАРОДНЫХ СТРУКТУР, ЯКІЯ ТЫЧАЦЦА СІТУАЦЫІ З ПРАВАМІ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ** 27

Іск Літвы супраць Беларусі ў сувязі з міграцыйным крызісам 27

Стварэнне трыбунала па агрэсіі супраць Украіны з магчымасцю заклікаць да адказнасці беларускія службовыя асобы 28

# УВОДЗІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі застаецца прадметам маніторынгу і аналізу з боку беларускіх і міжнародных НДА і міжнародных арганізацый. З 2012 г. дзейнічае мандат Спецыяльнага дакладчыка па сытуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. Таксама агляды падаюцца ў рамках альтэрнатыўных дакладаў грамадзянскай супольнасці ў дамоўныя органы, якія кантралююць выкананне асноўных канвенцый ААН у галіне правоў чалавека, а таксама ў дакладах саміх гэтых органаў. У сувязі з неабгрунтаваным ужываннем сілы, катаваннямі ў дачыненні да мірных пратэстоўцаў супраць сфальсіфікаваных выбараў у 2020 г. і распачатымі за імі рэпрэсіямі, у сакавіку 2021 г. быў заснаваны спецыяльны Мандат па сітуацыі ў Беларусі пад эгідай Вярхоўнага камісара ААН, які ў 2024 г. быў заменены групай незалежных экспертаў, што азначае большую самастойнасць і незалежнасць гэтага механізму.

З 2019 г. БХК разлічвае Нацыянальны індэкс па правах чалавека, у межах якога больш за 40 беларускіх экспертаў:к ацэньваюць змены асобна па кожным пункце каталога правоў чалавека. Беларускія НДА рэгулярна робяць профільныя маніторынгі сітуацыі з правамі чалавека, зыходзячы са сваёй спецыялізацыі.[1]

Спачатку падзеі 2020 года, пазней вайна ва Украіне і суўдзел Беларусі ў расійскай агрэсіі істотна змянілі становішча ў краіне, у тым ліку палітыку і практыку ў сферы правоў чалавека. Сітуацыя ўвесь час пагаршаецца: штодня становіцца вядома аб зменах заканадаўства, ініцыятывах уладаў,[2] канкрэтных парушэннях і г.д. У гэтым патоку інфармацыі **складана ўтрымаць фокус увагі**, размываецца мяжа паміж галоўным і негалоўным.

Каб не прапусціць найбольш значныя падзеі, лепш разумець сітуацыю ў Беларусі, і куды рухаецца дзяржава ў кантэксце вяршэнства права і правоў чалавека, мы адсочваем **найбольш значныя і якасныя змены асноўных трэндаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы правоў чалавека**.

Для гэтага з ліпеня 2023 года Беларускі Хельсінкскі Камітэт выпускае перыядычны агляд. Яго мэта - прадстаўляць нашыя экспертныя ацэнкі **найбольш значных і якасных змен у тэндэнцыях беларускай дзяржаўнай палітыкі** ў галіне правоў чалавека і рэакцыях на яе міжнароднай супольнасці за справаздачны перыяд па трох напрамках:

---

1 *Гл., у прыватнасці, Аналітычныя агляды сітуацыі з правамі чалавека, якія рыхтуе ПЦ «Вясна»: https://spring96.org/ru/publications; Агляды сітуацыі са свабодай асацыяцый і арганізацыямі грамадзянскай супольнасці Рэспублікі Беларусь, якія робіць Lawtrend: https://www.lawtrend.org/freedom-of-association/ezhegodnyj-monitoring; маніторынгі і Электронныя бюлетэні СМІ ў Беларусі, якія робіць БАЖ: https://baj.media/ru/aglyady_category/monitoringi-bazh/ і інш*

2 *Мы маем на ўвазе, што цяперашнія ўлады ў Беларусі з'яўляюцца ўладамі дэ-факта.*

- *агульныя меры:* сістэмныя рэчы - заканадаўства, стратэгіі, палітыкі, якія ў цэлым вызначаюць умовы і перадумовы рэалізацыі правоў чалавека ў краіне;

- *правапрымяняльная практыка:* тэндэнцыі парушэнняў грамадзянскіх і палітычных, сацыяльных, эканамічных і культурных правоў;

- *ключавыя рашэнні і рэакцыі міжнародных структур,* звязаныя з сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі.

Нашая аналітыка дапамагае лепш зразумець трэнды ў галіне правоў чалавека ў Беларусі (для міжнародных партнёраў - у прынцыпе лепш арыентавацца ў беларускім парадку дня), дае магчымасць адсочваць сістэмныя і якасныя змены сітуацыі, пашыраць правачалавечны фокус аналітыкі ў сумежных галінах (палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай і інш.), будзе карысная для выпрацоўкі стратэгій і пазіцый.

Аналітыка за 2023 г. прадстаўленая ў 2-х аглядах (за кожныя паўгода). Выпускі за 2023 г., а таксама зводную аналітыку за год у выглядзе інтэрактыўнай прэзентацыі можна знайсці тут.

У 2024 г. агляд выйшаў тройчы (па выніках кожных чатырох месяцаў). Усе выпускі, выніковую аналітыку 2024 г., а таксама аналіз за першы трыместр 2025 г. можна знайсці тут.

**Вы можаце падпісацца на наш агляд тут**

ПАДПІШЫЦЕСЯ НА НАСТУПНЫ ВЫПУСК ТРЭНДАЎ НА

TRENDS.BELHELCOM.ORG

# РЭЗЮМЕ

- Відавочны агульны трэнд чарговага вітка ў бок таталітарызацыі:

  - плануецца да ўвядзення адказнасць за пэўныя праявы/аспекты асабістага жыцця (устанаўліваецца адміністратыўная адказнасць за «прапаганду гамасэксуальных стасуткаў, змены полу, бяздзетнасці, педафіліі»);

  - пастаўленыя пад дадатковы кантроль магчымасці самавыяўлення ў стартыўнай, культурнай і адукацыйнай сферах (практычна манапалізуецца прадстаўніцтва на міжнародных конкурсах);

  - манапалізаваная сфера сярэдняй школьнай адукацыі (уведзеная забарона на анлайн-адукацыю ў замежных школах для дзяцей, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі). Гл. падрабязней пра кожны трэнд ніжэй.

- Пашырыўся пералік прафесій, доступ да якіх вызначаецца лаяльнасцю да дзяржавы. За апошнія два гады ўлады паступова змяняюць правілы атэстацыі, этычныя правілы, правілы прыёму на работу для цэлага шэрагу прафесій: экскурсаводы і гіды-перакладчыкі (другая палова 2023 і другі трыместр 2024); натарыюсы (другі трыместр 2024); педагагічныя работнікі (апошні трыместр 2024). У перыяд з мая па жнівень 2025 г. у гэтай сферы адбыліся чарговыя зрухі. Да ліку пераследаваных прафесій дадаліся: рыэлтары, аўдытары, антыкрызісныя кіраўнікі, таксама дададзеныя чарговыя змены і для экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў.

- Законапраект «Аб змене кодэксаў па пытаннях адміністратыўнай адказнасці» (ліпень 2025) замацоўвае забеспячэнне мерамі адміністратыўнай адказнасці некаторыя прынятыя раней дыскрымінацыйныя і рэпрэсіўныя меры галіновага заканадаўства:

  **Па-першае**, змены, унесеныя ў Закон аб правах дзіцяці (унесеныя ў снежні 2024 г., уступілі ў сілу ў ліпені 2025 г.), а менавіта пашыраны пералік «інфармацыі, якая можа нанесці шкоду здароўю і развіццю дзіцяці». Уводзіцца новы склад - **арт. 19.6 «Прапаганда гомасэксуальных стасункаў, змены пола, бяздзетнасці, педафіліі»**. У якасці санкцыі прадугледжаны штраф: для фізічнай асобы – да 20 базавых велічынь, для юрыдычнай асобы - ад 100 да 150. У выпадку, калі такія дзеянні «пацягнулі за сабой азнаямленне непаўналетніх» з такой інфармацыяй – санкцыі больш сур'ёзныя. Такім чынам, запазычаная ў Расіі практыка фармалізацыі дыскрымінацыі на падставе сэксуальнай арыентацыі, гендэрнай ідэнтычнасці і рэпрадуктыўнага выбару прайшла шлях ад размоў пра намеры (2023 г) да ўвядзення адміністрацыйнай адказнасці (2025 г).

**Па-другое**, указ А. Лукашэнкі № 459 «Аб прадстаўленне Рэспублікі Беларусь на міжнародных мерапрыемствах», прыняты ў снежні 2024 г. Уводзіцца новы склад - **арт. 24.62. «Незаконнае прадстаўленне Рэспублікі Беларусь на міжнародных мерапрыемствах»**. Цяпер парушэнне парадку адбору і ўдзелу ў такіх мерапрыемствах (толькі з дазволу дзяржавы), якое ў адпаведнасць з Указам лічыцца «парушэннем законных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь», прадугледжвае штраф у памеры ад 10 да 200 базавых велічынь, а для юрыдычнай асобы – ад 20 да 1000 базавых велічынь. Такім чынам, узмацняецца ідэалагічны кантроль за культурнай, спартыўнай і адукацыйнай сферамі (практычна дзяржаўная манапалізацыя), у чарговы раз скарачаецца сфера аўтаноміі інстытутаў грамадзянскай супольнасці. У чарговы раз пашыраныя магчымасці для парушэння права на недатыкальнасць прыватнага жыцця. У пачатку 2024 г. былі прынятыя заканадаўчыя змены ў сферы перавозкі пасажыраў і банкаўскіх аперацый, якія прадстаўляюць сілавым органам шырокія магчымасці па кантролі любых сфер жыццядзейнасці чалавека і пашыраныя паўнамоцтвы Следчага камітэта ў сферы доступа да персанальных дадзеных без згоды чалавека. Зараз дадаецца замацаваны заканадаўча кругласутачны доступ для органаў, якія ажыццяўляюць аператыўна-вышуковую дзейнасць, да аўтаматызаванай сістэмы ўліку і захоўвання дадзеных аб перамяшчэнні рэгістраваных паштовых адпраўленняў.

- Новыя заканадаўчыя змены ў сферы знешняй працоўнай міграцыі, якія падаюцца дзяржавай як меры па павышэнні эфектыўнасці рэгулявання, ставяць у больш уразлівае і дыскрымінацыйнае становішча як работнікаў-мігрантаў, так і іх працадаўцаў. Прыняты ў маі 2025 г. Указ А. Лукашэнкі № 202 «Аб павышэнні ролі наймальнікаў у галіне знешняй працоўнай міграцыі», з аднаго боку, замацоўвае за працадаўцам шэраг кантралюючых, неўласцівых яму функцый, здымаючы такім чынам адказнасці з дзяржавы, з іншага – парушае права свабоднага выбару працоўнай дзейнасці працаўніка-мігранта.

- Уведзеныя чарговыя змены датычна пенсійнага забеспячэння, якія патэнцыйна негатыўна паўздзейнічаюць на правы пенсіянераў, што знаходзяцца ў заключэнні: пенсіямі зняволеных цяпер будзе распараджацца не Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва, а сістэмы МУС. Уся сума працоўнай пенсіі будзе цяпер пералічвацца ў папраўча-працоўную ўстанову, і ўжо яна будзе здзяйсняць усе ўтрыманні і налічваць рэшту на рахунак чалавека. Пры гэтым нагадаем пра яшчэ адно важнае

абмежаванне (асвятлялася ў выпуску за за май-жнівень 2024): пашыраныя аснаванні для ўтрыманняў з пенсіі. Цяпер з пенсіянераў, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення у месцах пазбаўлення волі, могуць ўтрымліваць з пенсіі кампенсацыю кошту харчавання, камунальных паслуг, сродкаў асабістай гігіены, адзення і абутку.

- Працягвае прымаць новыя формы ціск і ідэалагізацыя ў сферы адукацыі

**Па-першае**, з 1 верасня 2025 г. уступілі ў сілу змены ў Кодэкс аб адукацыі. З'яўляецца важнае абмежаванне: забарона на дыстанцыйнае навучанне ў межах сярэдняй адукацыі за мяжой для дзяцей, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі. Змены наўрадці можна назваць барацьбой з адтокам дзяцей за мяжу – змены не тычацца тых, хто выехаў на часовае пражыванне і вучыцца там у мясцовых школах. Гэта – манапалізацыя дзяржаўнай школьнай адукацыі і абмежаванне доступу да беларускіх школьнікаў замежных адукацыйных установаў. І адначасова чарговая «крывая» спроба дзяржавы вырашыць пытанне сваіх адміністратыўных нязручнасцяў мерамі, якія абмяжоўваюць людзей у правах, заадно вырашаючы пытанні і ідэалагічнага кантролю. У выпуску за май-жнівень 2024 на стадыі законапраекта мы ўжо часткова аналізавалі іншыя змены, якія прапаноўваюцца ў тым жа пакеце і тычацца правілаў размеркавання (змякчэнне для сілавікоў і ўзмацненне жорсткасці для астатніх).

**Па-другое**, уводзяцца абавязковыя вучэбна-палявыя зборы для ўсіх 10-класнікаў, якія пачнуць дзейнічаць з 2026 г. Раней 10-дзённыя абавязковыя зборы былі толькі ў кадэтаў і сувораўцаў. Зборы будуць адбывацца з 26 мая па 5 чэрвеня – адразу па заканчэнні навучальнага года.

Акрамя ідэалагічных негатыўных эфектаў мілітарызацыі агульнай сярэдняй адукацыі (што парушае права на адукацыю ў вобласці мэтаў адукацыі), гэта ставіць шэраг пытанняў адносна парушэння іншых правоў дзіцяці, у прыватнасці свабоды сумлення

- Да асноўных супрацьпраўных практык за май-жнівень 2025 г можна аднесці:

    - новыя формы ціску на «дармаедаў»: улады сталі прыцягваць сілавыя органы, якія актыўна ўключыліся ў працу, рассылаючы ім апавяшчэнні з патрабаваннем аб яўцы (фактычна позвы) і дастаўляючы на пасяджэнне камісій па працаўладкаванні;

    - напярэдадні заканчэння тэрміну даўнасці актывізаваліся судовыя пасяджэнні па арт. 342 (арганізацыя або ўдзел у дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак);

- новыя практыкі ідэалагізацыі ў сферы адукацыі: «ваенна-патрыятычныя» групы па прыкладзе школ пачалі ствараць у дзіцячых садах;

- новыя формы трансгранічнага пераследу і ціску на сваякоў тых, хто з'ехаў: вядомыя выпадкі забору ў сваякоў генетычнага матэрыялу (слюны); па месцы рэгістрацыі тых, хто з'ехаў, пачалі прыходзіць лісты аб адказнасці за пратэрмінаваны пашпарт;

- новыя практыкі ціску на працоўных месцах: у прыватныя кампаніі Мінску выканкамы рассылаюць лісты з патрабаваннямі зрабіць справаздачы аб наяўнасці ў штаце асобнага спецыяліста, які адказвае за ідэалагічную працу (рэалізацыя Дырэктывы № 12 «Аб рэалізацыі асноваў ідэалогіі беларускуй дзяржавы»).

❍ Сярод важных рэакцый міжнароднай супольнасці:

**Па-першае**, Літва ініцыявала разбіральніцтва ў Міжнародным судзе ААН на падставе Пратакола супраць незаконнага ўвозу мігрантаў па сушы, моры і паветры, які дапаўняе Канвенцыю ААН супраць транснацыянальнай арганізаванай злачыннасці. Літва абвінавачвае Беларусь у садзейнічанні і забеспячэнні незаконнага ўвозу мігрантаў, а таксама ў непрыняцці неабходных мер на мяжы для прадухілення і выяўлення такога ўвозу, а таксама ў парушэнні яшчэ шэрагу абавязальніцтваў па пратаколе.

**Па-другое**, у маі быў створаны Спецыяльны трыбунал па злачынстве агрэсіі супраць Украіны. Гэта не з'яўляецца наўпроставай мерай ці рэакцыяй на сітуацыю з правамі чалавека ў Беларусі, але, тым не менш, ёсць важнай мерай у кантэксце прыцягнення да адказнасці беларускіх службовых асоб за саўдзел у расійскай агрэсіі супраць Украіны. Юрысдыкцыя трыбунала дапускае такую магчымасць пры наяўнасці доказаў істотнага ўкладу такіх асоб ў злачынства агрэсіі.

# І. АГУЛЬНЫЯ МЕРЫ: ЗАКАНАДАЎСТВА, СТРАТЭГІІ, ПАЛІТЫКІ, ЯКІЯ Ў ЦЭЛЫМ ВЫЗНАЧАЮЦЬ УМОВЫ І ПЕРАДУМОВЫ ДЛЯ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА Ў КРАІНЕ

ГАЛОЎНАЕ:

- планууецца да ўвядзення адказнасць за пэўныя праявы/аспекты асабістага жыцця (устанаўліваецца адміністратыўная адказнасць за «прапаганду гомасэксуальных стасункаў, змены пола, бяздзетнасці, педафіліі»);
- пастаўленыя пад дадатковы кантроль магчымасці самавыяўлення ў спартыўнай, культурнай і адукацыцыйнай сферах (практычна манапалізуецца прадстаўніцтва на міжнародных конкурсах);
- манапалізаваная сфера сярэдняй школьнай адукацыі (уведзеная забарона на ан-лайн адукацыю ў замежных школах для дзяцей, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі);
- да ліку прафесій, доступ да якіх вызначаецца лаяльнасцю дзяржаве, дадаліся: рыэлтары, аўдытары, антыкрызісныя кіраўнікі.

## ПАШЫРЭННЕ ЛЕГАЛІЗАЦЫІ СІСТЭМНЫХ РЭПРЭСІЙ

**1. Пашырэнне забароны/ўскладнення доступу да прафесіі для розных прафесійных груп.**

Праз фармалізацыю патрабаванняў лаяльнасці ўлады ўвесь час павышаюць жорсткасць да патрабаванняў для доступу да канкрэтных прафесій для розных прафесійных груп. За апошнія два гады ўлады паступальна змяняюць правілы атэстацыі, этычныя правілы, правілы прыёму на працу для цэлага шэрагу прафесій: экскурсаводы і гіды-перакладчыкі (другая палова 2023 і другі трымесрт 2024); натарыюсы (другі трымесрт 2024); педагагічныя работнікі (апошні трымесрт

2024). У перыяд з мая па жнівень 2025 г. у гэтай сферы адбыліся чарговыя зрухі. Да ліку рэгуляваных прафесій аддаліся:

### Рыэлтары

У маі 2025 г. прыняты Закон «Аб рыэлтарскай дзейнасці», цяпер гэта адзіны акт для рэгуляцыі гэтай дзейнасці. Для дадатковага кантроля галіны ствараецца орган «самакіравання» – Палата рыэлтараў. Правам аказання рыэлтарскіх паслуг будуць валодаць толькі рыэлтары, якія з'яўляюцца членамі Палаты і якія маюць пасведчанне аб атэстацыі.

У развіццё закона ў маі прынятая Пастанова Мінюста №45 «Аб правядзенні атэстацыйнага экзамена і выдачы пасведчання аб атэстацыі рыэлтара», якая, як і ў выпадку з экскурсаводамі і гідамі-перакладчыкамі устанаўлівае фільтры, якія проста ці ўскосна заснаваныя на лаяльнасці дзяржаве. Напрыклад, пасведчанне рыэлтара анулюецца ў выпадку (п.33):

- удзелу ўладальніка пасведчання ў несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах, а таксама ў выпадку публічных заклікаў да арганізацыі або ў выпадку правядзення такіх з парушэннем устаноўленага парадку іх арганізацыі або правядзення;
- удзелу ўладальніка пасведчання ў любым выглядзе дзейнасці, накіраваным на «дыскрэдытацыю» Рэспублікі Беларусь, органаў дзяржаўнай улады і кіравання (уключаючы асабісты ўдзел, пасярэдніцтва або супрацоўніцтва шляхам аказання паслуг, рэгістрацыю ў экстрэміцскіх фармаваннях і падпіску на інфармацыйныя рэсурсы, якія прызнаныя экстрэмісцкімі, тыражаванне і распаўсюджванне змешчанага ў іх кантэнту).

Такім чынам, магчымасць займацца прафесійнай дзейнасцю ставіцца ў наўпроставую залежнасць ад адмовы ад сваіх правоў (уключаючы свабоду сходаў, свабоду выказвання меркаванняў, права на інфармацыю), стварае дадатковы сталы ціск на чалавека.

Да здачы атэстацыйнага экзамену не будуць дапускацца асобы, звольненыя з суда, праваахоўных і іншых дзяржаўных органаў, іншых арганізацый па падставах, якія прызнаюцца ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі дыскрэдытуючымі абставінамі звальнення, – на працягу трох гадоў з дня прыняцця адпаведнага рашэння аб звальненні (п.4). Гэтая фармальна адэкватная падстава можа быць выкарыстаная для адвольнага пераследу і дадатковага ціску на людзей, звольненых з дзяржаўных органаў па палітычных матывах у перыяд з 2020 г.

Цікава заўважыць, што ў красавіку КДБ ажыццявіла шэраг рэйдаў з праверкамі па агенцтвах нерухомасці.

### Аўдытары

У маі 2025 г. зменены Закон «Аб змене Закона Рэспублікі Беларусь “Аб аўдытарскай дзейнасці”». З’яўляецца і ўдакладняецца патрабаванне мець «бездакорную дзелавую рэпутацыю» (да гэтага была проста «дзелавая рэпутацыя» з іншымі патрабаваннямі да яе). Аўдытар не мае права ажыццяўляць дзейнасць, калі ён «не адпавядае патрабаванню аб наяўнасці бездакорнай дзелавой (прафесійнай) рэпутацыі». Такое патрабаванне цяпер уключае, у тым ліку, адсутнасць незнятай або непагашанай судзімасці за шэраг злачынстваў, якія выкарыстоўваюцца ўладамі для адвольнага пераследу па палітычных прычынах (у прыватнасці арт. 342, 341-1, 361, 369-1, 369-2, 369-3 КК).

### Антыкрызісныя кіраўнікі

У маі 2025 г. Міністэрства эканомікі вынесла на грамадскае абмеркаванне (адбывалася з 13 па 25 мая) праект зменаў у Палажэнне аб парадку атэстацыі і пераатэстацыі фізічных асобаў на адпавядальнасць прафесійна-кваліфікацыйным патрабаванням, якія прад’яўляюцца да часовага (антыкрызіснага) кіраўніка.

Абгрунтаванне законапраекта кажа, што ён прымаецца, у тым ліку, «у мэтах забеспячэння допуску на рынак антыкрызіснага кіравання толькі кваліфікаваных спецыялістаў са станоўчым стаўленнем да дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў, канстытуцыйнага ладу».

Змены прапануюць дадаць новыя абгрунтаваннін спынення атэстата кіраўніка (п. 5 Палажэння), сярод якіх, таксама, як і ў выпадку са згаданымі вышэй сферамі дзейнасці, тыя, якія проста ці ўскосна ставяйць палітычны фактар У прыватнасці: наяўнасць у атэставанай асобы непагашанай ці незнятай судзімасці, наяўнасць факту прыцягнення да адміністратыўнай адказнасці за здзяйсненне правапарушэнняў, у тым ліку прадугледжаных артыкуламі, якія выкарыстоўваюцца для палітычна матываванага пераследу (арт. 19.10, 19.11, 24.23 КоАП). Пры гэтым тыя асобы, што прыцягваліся па гэтых жа артыкулах раней, наогул не дапускаюцца да атэстацыі; паступленне ад органаў дзяржаўнай бяспекі інфармацыі аб здзяйсненні атэставанай асобай дзеяння, якое стварае пагрозу нацыянальнай бяспецы.

Такім чынам, відавочнае ўстойлівае пашырэнне практыкі выкарыстання прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці, судзімасцяў па палітычна ангажаваных артыкулах для пазбаўлення доступу да прафесіі. Таксама ўлады наўмысна ствараюць сітуацыю сталай рызыкі страціць працу для спынення любых спробаў выказвання нязгоды з уладай. Гэта значыць дзяржава не проста імкнецца пакараць нелаяльных грамадзян праз адвольны адміністратыўны і/або крымінальны пераслед, але і зрабіць іх жыццё пасля адбыцця пакарання (якое само па сабе несправядлівае) таксама дастаткова складаным у сацыяльным

плане, пазбаўляючы нават права на свабодны выбар працы, не кажучы ўжо аб грамадзянскіх і палітычных правах. Важным паказнікам сістэмнасці праблемы з абмежаваннем працоўных правоў у рамках палітычных рэпрэсій, у тым ліку, служыць апошні (апублікаваны ў ліпені 2025) даклад Спецыяльнага дакладчыка па Беларусі, які прысвечаны менавіта парушэнню працоўных правоў.

### ❍ Экскурсаводы і гіды-перакладчыкі

Экскурсаводы і гіды-перакладчыкі – прафесіі, якія дзяржава з дзіўнай настойлівасцю не пакідае ў спакоі з другой паловы 2023 г., калі Міністэрства спорту і турызму зацвердзіла прафесійныя і этычныя патрабаванні. Яны змяшчалі шэраг ідэалагізаваных палажэнняў, аж да патрабавання да колеру адзення, якія прымушаюць экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў цэнзураваць і сябе, і турыстаў. Потым, у 2024 г. былі ўнесеныя змены ў Палажэнне аб парадку і умовах праходжання прафесійнай атэстацыі экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў, якія зрабілі больш складаным доступ да прафесіі, бо грунтаваліся на гісторыі палітычнага пераследу і на парушэнні новых этычных правілаў.

30 красавіка 2025 г. былі ўнесеныя чарговыя змены у прафесійныя і этычныя патрабаванні да экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў 2023 г. Акрамя іншага, цяпер з'явіліся два новыя патрабаванні, заснаваныя на новым комплексным «зводзе правілаў» у сферы ідэалогіі - Дырэктыве № 12 (аналізаваная ў выпуску за студзень-красавік 2025): ведаць асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы, зацверджаныя Дырэктывай Прэзідэнта N 12, укараняць напрамкі ідэалагічнай работы ў сваёй прафесійнай дзейнасці (п. 5-1) і садзейнічаць умацаванню станоўчага міжнароднага іміджу краіны і прызнанню ўнікальнасці беларускай мадэлі грамадскага развіцця (п. 5-2).

Асаблівая ўвага дзяржавы да экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў тлумачыцца тым, што яны працуюць з замежнікамі і дзяржаве важна (па розных прычынах з рознымі групамі замежнікаў) забяспечваць ідэалагічнае афармленне палітыкі памяці, уключаючы наратыў аб «фальсіфікацыі гісторыі». Асаблівая важнасць гэтай сферы ў такім сэнсе пацвярджаецца таксама ўвагай да яе адыёзных прапагандыстаў, якія прапануюць стварыць базу «нармальных экскурсаводаў», таму што «гэта важна для захавання краіны».

### 2. Дзяржаўная манапалізацыя міжнароднага прадстаўніцтва ў культурнай, спартыўнай і адукацыйнай сферах як форма падаўлення грамадзянскай супольнасці.

У ліпені 2025 г. у Палату прадстаўнікоў унесены законапраект «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях адміністратыўнай адказнасці». У ім прапануецца новы склад - **арт. 24.62. Незаконнае прадстаўленне Рэспублікі Беларусь на міжнародных мерапрыемствах**. Артыкул забяспечвае мерамі адказнасці

прынятіы ў снежні 2024 г. Загад А. Лукашенкі № 459 «Аб прадстаўленні Рэспублікі Беларусь на міжнарожных мерапрыемствах». Указ прыняты для «ўпарадкавання адбору асобаў і прадстаўлення Рэспублікі Беларусь на міжнарожных мерапрыемствах, якія праводзяцца за яе межамі». Іншымі словамі – практычна манапалізацыя для ўзмоцненага кантроля тых, хто выязджае за мяжу для ўдзелу ў культурных, адукацыйных, спартыўных мерапрыемствах ( такія сферы пазначаныя ва Ўказе), прадстаўляючы краіну.

Указ, у прыватнасці, замацоўвае, што выкарыстанне словаў «Рэспубліка Беларусь», «Беларусь», «нацыянальны», «беларускі» можа выкарыстоўвацца ў мерапрыемствах па адборы ўдзельнікаў для прадстаўлення краіны за мяжой, толькі калі арганізатарам выступае дзяржаўны (ці ўпаўнаважаны ім) орган. Прадстаўляць Рэспубліку Беларусь на міжнародным мерапрыемстве, звязаным з вызначэннем краінавага пераможны, **дзе дзяржава можа быць прадстаўленая толькі адным чалавекам або камандай**, цяпер можна толькі з дазволу дзяржавы (менавіта з дазволу, а не з уведамлення). Уведамленне аб удзеле накіроўваецца ў пісьмовым выглядзе ў адпаведны дзяржаўны орган да падачы заяўкі на ўдзел у міжнародным мерапрыемстве, калі ўдзел непрыймальны – дзяржаўны орган інфармуе пра гэта. Такім чынам фактычна цэнтральныя органы выканаўчай улады прымаюць рашэнні пра мэтазгоднасць/магчымасць удзелу прадстаўнікоў Беларусі **ў большасці значных** міжнародных культурных, адукацыйных, спартыўных мерапрыемстваў спаборніцкага характару. Парушэнне такога парадку лічыцца **«парушэннем законных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь».**

Пры гэтым фармулёўка п. 1.2 Указа, якая вызначае конкурсы, што трапляюць пад сферу ягонай дзейнасці – «дакументамі аб правядзенні якога прадугледжана прадстаўніцтва дзяржавы толькі адной фізічнай асобай, адной групай асоб (у тым ліку дэлегацыяй, камандай, калектывам)» – выклікае шэраг пытанняў. Напрыклад, ці трапляюць пад яе конкурсы, дзе існуюць розныя ўзроставыя намінацыі і ў кожнай можа быць прадстаўлена каманда ад краіны. Ці сапраўды гэты ўказ будзе распаўсюджвацца толькі на такія конкурсы, як указана, ці ж на практыцы на ўсе (ёсць шмат іншых конкурсаў, дзе магчымы ўдзел некалькіх прадстаўнікоў/каманд ад краіны)? Ці будзе гэты ўказ распаўсюджвацца на міжнародныя выставы жывёл і многае іншае? Гэта будзе зразумела толькі з практыкі яго прымянення.

Новы адміністрацыйны склад прадугледжвае за парушэнне такога парадку штраф у памеры ад дзесяці да двухсот базавых велічынь, а для юрыдычнай асобы – ад дваццаці да тысячы базавых велічынь.

Такім чынам, улады ставяць пад свой кантроль усе культурныя, спартыўныя і адукацыйныя сферы, каб не дапусціць на міжнародныя пляцоўкі «няправільных» удзельнікаў. Гэта парушае прынцып роўнага доступу да магчымасцяў рэалізоўваць сябе і свае здольнасці. Незразумела, на якіх падставах і па якіх крытэрах будзе прымацца рашэнне аб магчымасці ўдзелу, ды і сама неабходнасць пытацца

пра такі дазвол парушае цэлы шэраг правоў і свабод, у першую чаргу - свабоду асацыяцыі.

### 3. Пашырэнне магчымасцяў адвольнага доступа дзяржавы (сілавых органаў) да персанальных дадзеных/умяшальніцтва ў прыватнае жыццё

Стала набываюць новыя вымярэнні механізмы ўмяшальніцтва ў права на недатыкальнасць асабістага жыцця, якія цягнуць за сабой дадатковыя магчымасці для палітычна матываванага пераследу.

На пачатку 2024 г. мы адзначалі заканадаўчыя змены ў сферах перавозкі пасажыраў і банкаўскіх аперацый, якія прадстаўляюць сілавым органам шырокія магчымасці па сачэнні за людзьмі і кантролі любых сфер іх жыццядзейнасці. А таксама пашырэнне паўнамоцтваў Следчага камітэта без згоды фізічных асоб атрымліваць звесткі з інфармацыйных рэсурсаў і сістэм, якія змяшчаюць персанальныя дадзеныя, а таксама мець да іх аддалены доступ.

У маі 2025 г. прынятыя змены у Закон «Аб паштовай сувязі». Цяпер з'яўляецца новая аўтаматызаваная сістэма ўліку і захоўвання дадзеных аб перамяшчэнні рэгіструемых паштовых адпраўленняў і кругласутачны доступ да яе, у тым ліку для органаў, якія ажыццяўляюць аператыўна-вышуковую дзейнасць, без належных працэдурных (судовых) гарантый.

Акрамя таго, што сілавыя органы могуць у цэлым злоўжываць такім правам у мэтах адвольнага ўмяшальніцтва ў прыватнае жыццё чалавека, гэта таксама стварае дадатковыя рызыкі для дачынення між беларусамі, якія жывуць за мяжой з-за палітычнага пераследу, і іх роднымі і блізкімі, якія застаюцца ў Беларусі. Гэта можа быць фактарам, які ўплывае на самацэнзураванне. Нягледзячы на тое, што ў старой рэдакцыі закона і так змяшчаўся абавязак паштовых аператараў забяспечыць доступ такіх органаў да баз дадзеных, новыя змены наогул прыбіраюць якія-небудзь працэсуальныя гарантыі і дазваляюць ім практычна бескантрольна мець магчымасць ўмешвацца ў прыватнае жыццё чалавека і ў гэтай сферы.

### 4. Пашырэнне розных форм трансгранічнага пераследу і ціску

Дзяржава стала пашырае інструментарый для трансгранічнага пераследу беларусаў, якія вымушаныя пакінуць краіну па палітычных прычынах, у тым ліку імкнучыся стварыць максімальныя нязручнасці ў плане распараджэння з-за мяжы сваёй уласнасцю. У 2023 г. прыняты «пашпартны ўказ» – рэпрэсіўны інструмент з самымі шырокімі трансгранічнымі вынікамі.

У чэрвені 2025 г. у першым чытанні прыняты праект Закона «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спыненні дзейнасці) суб'ектаў гаспадарання», якім змяняюцца правілы выхаду ўдзельнікаў таварыства з абмежаванай або

дадатковай адказнасцю са свайго бізнесу. Паводле тлумачэнняў эксперта, у адпаведнасці з новымі нормамі заяўленне пра выхад трэба будзе падаваць не ў сваю ж кампанію – як было раней (форма падачы не рэгулявалася), а натарыюсу (гэта значыць цяпер яно павінна быць натарыяльна ўдаставераным), што патрабуе асабістага з'яўлення ўдзельніка або яго прадстаўніка да натарыюса.

Такім чынам, сітуацыя ўскладняецца для людзей, якія знаходзяцца за мяжой і не маюць магчымасці вярнуцца ў Беларусь.

## ФАРМАЛІЗАЦЫЯ ДЫСКРЫМІНАЦЫІ ПА ПРЫКМЕТАХ СЭКСУАЛЬНАЙ АРЫЕНТАЦЫІ, ГЕНДЭРНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ І РЭПРАДУКТЫЎНАГА ВЫБАРУ

Атрымлівае далейшае заканадаўчае замацаванне запазычаная ў Расіі дыскрымінацыйная практыка прамога пераследу ЛГБТК + супольнасці. Мы адсочвалі трэнд: у 2023 г. улады пачалі казаць пра гэта; у 2024 г. прынялі некаторыя нормы ў галіновым заканадаўстве: зменены вызначэнне парнаграфіі ў Інструкцыі Міністэрства культуры (прававы аналіз БХК можна паглядзець тут) і змены ў заканадаўстве пра абарону дзяцей (кароткі аналіз гл. у выпуску за верасень- снежань 2024); у 2025 г. – уводзіцца адміністратыўная адказнасць.

Законапраект «Аб змене кодэксаў па пытаннях адміністратыўнай адказнасці», які згадваўся вышэй, унесены ў ліпені 2025 г. у Палату прадстаўнікоў, прапаноўвае увесці новы склад – арт. 19.6 «Прапаганда гомасэксуальных стасункаў, змены полу, бяздзетнасці, педафіліі». Да такой адносіцца «распаўсюд у любой форме інфармацыі ў мэтах фарміравання ў грамадзян уяўленняў аб прывабнасці гомасэксуальных адносін, змены полу, бяздзетнасці або аб прызнанні педафіліі дапушчальнай». У якасці санкцыі прадугледжаны штраф для фізічнай асобы - да дваццаці базавых велічынь, для юрыдычнай асобы - ад ста да ста пяцідзесяці. У выпадку, калі такія дзеянні «пацягнулі азнаямленне непаўналетніх» з такой інфармацыяй - сумы штрафу яшчэ большыя, а для фізічнай асобы дадаецца магчымасць арышту або грамадскіх работ.

У выпадку прыняцця гэта будуць не проста чарговыя дыскрымінацыйныя палажэнні заканадаўства, якія супрацьрэчаць і Канстытуцыі Беларусі і яе міжнародным абавязальніцтвам, але яркае праяўленне руху да таталітарызму. Якасным «падзеннем» у адыходзе ад фармальнай роўнасці ў гэтым выпадку ёсць той факт, што:

**па-першае**, такія змены фактычна ўводзяць адказнасць за пэўныя праявы асабістага жыцця і ідэнтычнасці чалавека, такім чынам стыгматызуючы іх;

**па-другое**, такія змены тычацца не толькі ЛГБТК + супольнасці: акрамя любых формаў праявы ідэнтычнасці і пазіцыі ЛГБТК + супольнасці пад забарону могуць патрапіць многія феміністкія погляды, праваабарончыя пазіцыі, якія тычацца прасоўвання роўнасці, абароны асабістага жыцця, правоў жанчын і правоў ЛГБТК+ людзей, а таксама інфармацыйныя матэрыялы, у прыватнасці, у галіне сэксуальнай асветы і сямейнага планавання, мастацкія творы і многае іншае.

Падрабязней гл. аналіз прапанаваных зменаў і вынікаў іх магчымага прыняцця для людзей і арганізацый, падрыхтаваны БХК сумесна з квір-ініцыятывай «Прызматыка».

## РАШЭННЕ ПЫТАННЯЎ НЕДАХОПУ ГРАШОВЫХ РЭСУРСАЎ І АДТОКУ ЧАЛАВЕЧАГА КАПІТАЛА ПРАЗ ПАРУШЭННЕ ЭКАНАМІЧНЫХ І САЦЫЯЛЬНЫХ ПРАВОЎ

### 1. Рэгуляванне знешняй працоўнай міграцыі: дадатковыя абмежаванні працадаўцы і парушэнне правоў мігрантаў

У маі 2025 г. прыняты Указ А. Лукашэнкі № 202 «Аб павышэнні ролі наймальнікаў у вобласці знешняй працоўнай міграцыі». Ён замацоўвае дадатковыя абавязкі і абмежаванні для наймальнікаў ( у тым ліку прыватных бізнэсаў), «Якія прыцягваюць працаўнікоў-імігрантаў для ажыцяўлення пракоўнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь». Адзначым, што ў тэксце Указа такія працаўнікі называюцца менавіта «імігранты», а не мігранты, што агулам сведчыць пра цьмянае прадстаўленне ўладаў пра розніцу паміж людзьмі, якія часова прыяжджаюць у краіну для заробкаў, і тымі, хто пераяжджае на сталае месца жыхарства, і агулам пра міжнародны рынак працы.

Функцыі такіх наймальнікаў робяцца падобнымі на сумесь функцый кантралюючага органа і класнага кіраўніка. У прыватнасці, цяпер наймальнік абавязаны: прызначыць лакальным прававым актам «асоб, адказных за ажыццяўленне кантролю працоўнай дзейнасці і ўмоў знаходжання (пражывання) працоўных-імігрантаў», забяспечыць наведванне месцаў іх пражывання з мэтай кантролю фактычнага пражывання, адпаведнасці ўмоў пражывання санітарным нормам. Наймальнік таксама абавязаны арганізаваць ацэнку ведаў такім работнікам адной з дзяржаўных моў (для пераліку прафесій, які будзе вызначаны ўрадам), кантраляваць тэрміны дзеяння іх дакументаў (віза, пасведчанне кіроўцы і г.д.).

Важна адзначыць, што пры гэтым забаронены часовы перавод працоўных-мігрантаў да іншага наймальніка. Гэта робіць працаўладкаванне неадпаведным

праву чалавека на свабоду працы, замацаванаму як у Канстытуцыі Беларусі (арт. 41), так і ў яе міжнародна-прававых абавязальніцтвах. Гэта таксама з'яўляецца наўпроставай дыскрымінацыяй па прыкмеце грамадзянства (такая забарона дзейнічае толькі ў дачыненні да працоўных-мігрантаў). Па сутнасці такія ўмовы працы могуць кваліфікавацца як практыка, падобная да прымусовай працы.

Паказальная рыторыка МУС пры каментары Указа, там выкарыстоўваецца фармулёўка: «забараняецца перадача працаўнікоў іншаму наймальніку». Гэта значыць МУС агулам вербальна інструменталізуе мігрантаў.

МУС адзначае, што актуальнасць дакумента звязаная з тым, што істотна павялічылася колькасць замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія прыбываюць, каб займацца працоўнай дзейнасцю. І, з аднаго боку, лагічна, што дзяржава на гэта можа і павінна рэагаваць дадатковым прававым рэгуляваннем. Але з іншага боку, форма, у якой гэта зроблена, у гэтай сітуацыі не вырашае пытанні, а стварае шмат новых праблем, прычым не для дзяржавы, а для наймальнікаў.

Неўласцівыя функцыі кантролю - спроба дзяржавы, як гэта адбываецца і ў іншых сферах, зняць з сябе і частку адказнасці, і частку таго, што трэба «рабіць рукамі», перакладаючы, па сутнасці, функцыі органаў унутраных спраў і іншых ведамстваў, якія адказваюць за інтэграцыю мігрантаў у грамадства, на канкрэтных юрыдычных асоб. Пры гэтым незразумела, якія гарантыі ёсць у наймальніка ў выпадку нядобрасумленных дзеянняў мігранта, якім чынам і дзе замацаваны працэдурныя гарантыі і для аднаго, і для другога. Усё гэта ператварае наём такіх работнікаў у абузу, а саміх мігрантаў змяшчае ў яшчэ больш слабае становішча.

### 2. Абмежаванне у пенсійным забеспячэнні асобаў, якія ўтрымліваюцца ў зняволенні

У чэрвені 2025 г. падпісаныя змены ў Закон пра пенсіянае забеспячэнне (уступаюць у сілу з 1 кастрычніка 2025 г.). У адпаведнасці з імі, пенсіямі зняволеных цяпер будзе распараджацца не Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва, а сістэма МУС. Уся сума працоўнай пенсіі цяпер будзе пералічвацца ў папраўча-працоўную ўстанову, і ўжо яна будзе вылічваць усе ўтрыманні і залічаць рэшту на рахунак чалавека. Раней гэтыя маніпуляцыі здзяйсняў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва.

У выпуску за май-жнівень 2024 мы ўжо аналізавалі на стадыі законапраекта некаторыя змены ў гэтай сферы, якія зніжалі сацыяльныя гарантыі пенсіянерам, што знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі. У прыватнасці, пашыраныя падставы для ўтрыманняў з пенсіі. Цяпер з пенсіянераў, якія знаходзяцца ў

месцах пазбаўлення волі, можа ўтрымліваецца кампенсацыя кошту харчавання, камунальных паслуг, сродкаў асабістай гігіены, адзення і абутку.

У Міністэрстве сацыяльнай абароны растлумачылі, што перадача адміністравання пенсіі папраўча-працоўным установам будзе спрашчэннем працэсу. Магчыма, дзяржаве так будзе сапраўды прасцей, аднак з пункту гледжання чалавека ўзнікае шэраг патэнцыйных праблем. Як адзначаюць праваабаронцы, незразумела, што будзе з пенсіямі, якія па даверанасці ад зняволенага атрымліваюць людзі на волі, бо гэта быў адзіны варыянт, як зняволены пенсіянер мог перадаць грошы сваім сваякам, напрыклад, для аплаты камунальных плацяжоў. Калі цяпер атрыманне пенсіі па даверанасці будзе забаронена, ёсць верагоднасць, што да камунальных і іншых плацяжоў асуджаных будзе прымяняцца механізм прымусовага спагнання запазычанасцяў «з дадатковымі абцяжараннямі за пратэрміноўку і за працу судовых выканаўцаў».

Такая норма таксама з'яўляецца дыскрымінацыйнай, бо пенсіянеры ў зняволенні знаходзяцца ў іншым становішчы і з вялікай доляй верагоднасці не змогуць свабодна распараджацца сваімі сродкамі, у параўнанні з пенсіянерамі, якія знаходзяцца на волі. Ці, прынамсі, такое распараджэнне будзе істотна ўскладнена.

## УЗМАЦНЕННЕ ЦІСКУ Ў СФЕРЫ АДУКАЦЫІ: АБМЕЖАВАННЕ АДУКАЦЫЙНЫХ ПРАВОЎ І МІЛІТАРЫЗАЦЫЯ

### 1. Абмежаванні адукацыйных правоў: забарона анлайн-навучання ў замежных установах сярэдняй адукацыі для дзяцей, якія пражываюць у Беларусі - устанаўленне дзяржаўнай манаполіі на сярэднюю адукацыю

У снежні 2024 г. былі прынятыя комплексныя змены ў сферы адукацыі – Закон «Аб змене кодэксаў па пытаннях адукацыі», які ўступае ў сілу з верасня 2025 г. У выпуску за май-жнівень 2024 на стадыі законапраекта мы ўжо часткова аналізавалі прапанаваныя змены, якія тычацца правіл размеркавання (змягчэнне для сілавікоў і ўзмацненне жорсткасці для астатніх)

З 1 верасня 2025 г. уступіла ў сілу яшчэ адно важнае абмежаванне: пашыраная норма аб абавязку законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў забяспечваць умовы для атрымання адукацыі і развіцця навучэнцаў. Цяпер законныя прадстаўнікі непаўналетніх абавязаны «забяспечваць умовы для

атрымання адукацыі і развіцця навучэнцаў, у тым ліку для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі іх непаўналетнімі дзецьмі, якія пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь». (п. 15 арт. 2 Закона). У старой рэдакцыі гэты пункт быў сфармуляваны як «забяспечваць умовы для атрымання адукацыі і развіцця навучэнцаў». Іншымі словамі, уведзеная забарона на дыстанцыйнае навучанне ў замежных школах у рамках атрымання сярэдняй адукацыі (у Беларусі можна было навучацца анлайн у расійскіх і некаторых заходніх школах). З улікам практычна поўнай ліквідацыі прыватных школ фактычна ўведзеная дзяржаўная манаполія ў сферы сярэдняй адукацыі.

Нягледзячы на некаторыя экспертныя меркаванні, што гэта мера, накіраваная на прыпынненне адтоку моладзі за мяжу, асноўная мэта меры бачыцца ўсё ж у забеспячэнні ідэалагічнага кантролю праз бюракратычную манапалізацыю. Улады патлумачылі, што мера азначае забарону на дыстанцыйнае навучанне ў замежных школах дзяцей, якія пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і атрымліваюць тут сярэднюю адукацыю.Тыя ж, хто выязджае на часовае месца жыхарства за рубеж, не звязаныя гэтай нормай, таму яна насамрэч не перашкаджае аб'езду дзяцей з краіны.

Пры тым з тлумачэнняў уладаў відавочны ідэалагічны складнік такога рашэння: «Беларуская школа – гэта не толькі пра веды, але і пра выхаванне». Ёсць і больш абгрунтаваныя тлумачэнні, з якіх бачна, што гэта – адна са спробаў вырашыць свае праблемы забаронамі, якія перашкаджаюць чалавеку рэалізоўваць свае правы. Чыноўнікі Міністэрства адукацыі адзначаюць, што ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі Беларусі няма такога паняцця, як «анлайн-адукацыя» або «дыстанцыйнае навучанне», і з'яўляецца шмат праблем з атэстацыяй дзяцей, якія навучаліся недзе анлайн, у адпаведнасці з партабаванямі беларускага заканадаўства.

Дадзеная мера парушае права дзяцей на адукацыю і правы іх законных прадстаўнікоў, у тым ліку на свабоду выбару формаў адукацыі. Арт. 28 Канвенцыі аб правах дзіцяці сведчыць пра тое, што дзяржава абавязана заахвочваць развіццё розных формаў сярэдняй адукацыі. Заўвага агульнага парадку № 1 да арт. 29 Канвенцыі асабліва падкрэслівае неабходнасць уліку школамі інтарэсаў дзіцяці ў самым поўным значэнні гэтага паняцця, а таксама тое, што школы павінны прадстаўляць дзецям магчымасць развівацца па меры змены іх здольнасцяў. Беларуская дзяржава, як у многіх выпадках, ідзе па самым простым шляху – дзяржаўнай манапалізацыі, замест дыверсэфікаванага падыхода.

## 2.Агульнаабавязковыя вучэбна-палявыя зборы для ўсіх дзесяцікласнікаў

Працягвае пашырацца працэс мілітарызацыі адукацыі, які быў запушчаны ўжо пасля падзей 2020 г., але асабліва інтэнсіфікаваўся пасля пачатку поўнамаштабнага ўварвання Расіі ва Украіну. Вяртанне ў школы ў 2021 г. пасады ваенрукоў (кіраўнікоў ваенна-патрыятычнага выхавання) - інстытута савецкай адукацыйнай сістэмы - за 4 гады развілося ў куды больш сур'ёзную меру: уводзяцца абавязковыя вучэбна-палявыя зборы для ўсіх 10-класнікаў. Улады тлумачаць, што раней 10-дзённыя абавязковыя зборы былі толькі ў кадэтаў і суվораўцаў. З 2026 г. яны стануць абавязковымі для ўсіх навучэнцаў 10-х класаў. Зборы будуць праходзіць з 26 мая па 5 чэрвеня – адразу пасля заканчэння навучальнага года.

Акрамя ідэалагічных негатыўных эфектаў мілітарызацыі агульнай сярэдняй адукацыі (што парушае права на адукацыю ў частцы мэтаў адукацыі), гэта ставіць шэраг пытанняў адносна парушэння іншых правоў дзіцяці, у прыватнасці свабоды сумлення.

# II. ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНАЯ ПРАКТЫКА: ПАРУШЭННІ ГРАМАДЗЯНСКІХ, ПАЛІТЫЧНЫХ, САЦЫЯЛЬНЫХ, ЭКАНАМІЧНЫХ І КУЛЬТУРНЫХ ПРАВОЎ

ГАЛОЎНАЕ:

- новыя формы ціску на «дармаедаў»: улады сталі прыцягваць сілавыя органы, якія актыўна ўключыліся ў працу, рассылаючы апавяшчэнні з патрабаваннем аб яўцы (фактычна позвы) і дастаўляючы на пасяджэнне камісій па працаўладкаванні;
- новыя практыкі ідэалагізацыі ў сферы адукацыі: «ваенна-патрыятычныя» групы па прыкладзе школ пачалі стварацца ў дзіцячых садках;
- новыя формы трансгранічнага пераследу і ціску на сваякоў тых, хто з'ехаў: вядомыя выпадкі забору ў сваякоў генетычнага матэрыялу (сліны); па месцы рэгістрацыі тых, хто з'ехаў, пачалі прыходзіць лісты аб адказнасці за пратэрмінаваны пашпарт.

## НОВЫЯ ФОРМЫ ЦІСКУ НА «АСОБ, НЕ ЗАНЯТЫХ У ЭКАНОМІЦЫ» («ТУНЕЯДЦАЎ»)

У маі 2025 г. зрабілася вядома, што людзям, якія лічацца «незанятымі ў эканоміцы», пачалі прыходзіць апавяшчэнні з міліцыі з патрабаваннем з'явіцца ў камісію па працаўладкаванні, падобныя на позвы. Раней такая прктыка не фіксавалася: раней былі толькі лісты з прапановай падцвердзіць свой статус або звярнуцца па дапамогу ў працаўладкаванні. Паля таго, як ў студзені 2025 г. А. Лукашэнка заклікаў надзяляць больш увагі працы з «дармаедамі», у некаторых раёнах да справы падключылася міліцыя (у выглядзе рэйдаў па месцы жыхарства).

У новых уведамленнях гаворыцца, што такую працу міліцыя праводзіць у мэтах «забеспячэння выканання канстытуцыйнага абавязку грамадзян аб удзеле ў

фінансаванні дзяржаўных выдаткаў шляхам выплаты падаткаў». У некаторых раёнах міліцыя пагражае адміністратыўнай адказнасцю тым, хто не з'явіцца, атрымаўшы такое ўведамленне. Вядомыя таксама выпадкі прымусовага дастаўляння на камісію па працаўладкаванні.

Відавочна, што новы віток супрацьпраўнай практыкі запалохвання, якая рэалізуе такое ж неправавое заканадаўства, што прымушае людзей да працы, не рэгламентаваны цэнтралізавана. Ёсць нейкі агульны запыт на« ўзмацненне працы», які ўсюды разумеецца па-рознаму. Гэта стварае яшчэ большую непрадказальнасць і непразрыстасць, робячы людзей практычна безабароннымі перад дзяржаўнымі органамі, якія «імі займаюцца».

## АКТЫВІЗАЦЫЯ ПАСЯДЖЭННЯЎ СУДОЎ НАПЯРЭДАДНІ ЗАКАНЧЭННЯ ТЭРМІНАЎ ДАЎНАСЦІ

Праваабаронцы ПЦ «Вясна» адзначаюць, што ў апошнія месяцы сталі актыўна праходзіць суды па арт. 342 (арганізацыя або ўдзел у дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак). Па гэтым артыкуле ў 2025 годзе заканчваецца тэрмін даўнасці (5 гадоў). У ліпені 2025 праваабаронцы адзначалі, што судовыя працэсы па гэтым артыкуле «у апошнія тыдні пастаўлены практычна на паток».

## УЗМАЦНЕННЕ КАНТРОЛЯ І ІДЭАЛАГІЗАЦЫІ Ў СФЕРЫ АДУКАЦЫІ

Практыкі па ўзмацненні кантроля і ідэалагізацыі ў сферы адукацыі пашыраюцца на фоне фармалізацыі ідэалогіі на ўсіх узроўнях. У гэты раз «ваенна-патрыятычныя» групы па прыкладзе школ пачалі ствараецца ў дзіцячых садках.

Такім чынам, на фоне ўсеагульнага заканадаўчага і правапрымяняльнай закручвання «ідэалагічных гаек», з'яўляецца відавочнай ступень адсутнасці тармазоў. Асаблівая ўразлівасць і псіхалагічная няспеласць дзяцей дашкольнага ўзросту робіць такія практыкі не проста парушэннем правоў дзяцей і іх бацькоў (што тычыцца натуральна дзяцей любога ўзросту), але і глыбока амаральнымі дзеяннямі.

## НОВЫЯ ФОРМЫ ТРАНСГРАНІЧНАГА ПЕРАСЛЕДУ І ЦІСКУ НА СВАЯКОЎ ТЫХ, ХТО ВЫМУШАНА З'ЕХАЎ

**Па-першае**,у жніўні 2025 г. зрабілася вядома, што ў Магілёўскай вобласці супрацоўнікі сілавых органаў збіраюць генетычны матэрыял (сліну) сваякоў людзей, якія з'ехалі з Беларусі. Па словах праваабаронцаў, якія прадставілі журналістам гэтую інфармацыю, супрацоўнікі РАУС сказалі, што фармуецца база дадзеных ДНК, каб у выпадку неабходнасці людзей за мяжой «можна было апазнаць». Па звестках праваабаронцаў, такая практыка мае месца ў розных гарадах Беларусі.

**Па-другое**, таксама ў жніўні ПЦ «Вясна» паведаміў пра новую практыку – тым, хто з'ехаў па палітычных прычынах па месцы рэгістрацыі ў Беларусі сталі прыходзіць лісты аб адказнасці з-за пратэрмінаванага пашпарта. У лісце тлумачыцца, што пражыванне па несапраўдных дакументах, якія сведчаць асобу, цягне накладанне штрафу, і прапануецца звярнуцца ў Аддзел па грамадзянстве і міграцыі для замены пашпарта.

Такая практыка выглядае асабліва цынічнай, улічваючы, што людзі не могуць змяніць пратэрмінаваныя дакументы менавіта па віде ўладаў – з-за дзеяння г. зв. «пашпартнага указа», які быў прыняты ў верасні 2023 г.

## НОВЫЯ ФОРМЫ ЦІСКУ НА ПРАЦОЎНЫХ МЕСЦАХ

Чаканым і заканамерным вынікам прыняцця ў красавіку 2025 г. Дырэктывы № 12 «Аб рэалізацыю асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы» (была аналізаваная ў выпуску за студзень-красавік 2025) зрабілася ўзмацненне ціску на працоўных месцах, якое мы і прагназавалі ў сваім аналізе. Прыватнаму сектару ў Дырэктыве нададзена асаблівая ўвага: адной з мэтаў дакумента дэкларуецца «неабходнасць даносіць дзяржаўную позву да грамадзян, занятых у прыватным сектары эканомікі».

У жніўні зрабілася вядома, што ў прыватныя кампаніі Мінска выканкамы рассылаюць лісты з патрабаваннем даць справаздачу аб наяўнасці ў штаце асобнага спецыяліста, які адказвае за ідэалагічную працу. У дырэктыве № 12 як раз падрабязна прапісаныя пасады адказных за «ідэалагічную працу», прызначэнне, вызваленне ад пасад і падаўжэнне кантрактаў з якімі падлягаюць узгадненню на розных узроўнях.

Па словах чыноўніцы, за невыкананне такога патрабавання штраф не прадугледжаны (гэта ж дырэктыва, а не ўказ), але патрабаваць яны ўсё роўна будуць. І гэта зразумела, бо у сваю чаргу, выканання будуць патрабаваць ад Менгарвыканкама - Дырэктыва забяспечыла стабільны ціск уздоўж усёй уладнай вертыкалі.

Гэты ціск будзе змушаць кампаніі ўрэшце прызначаць такіх адказных, якія, у сваю чаргу, будуць вымушаныя гуляць прадпісаную ролю (як будзе патрабавацца справаздачнасць), стыгматызуючы сябе ў цяперашніх умовах.

# III. КЛЮЧАВЫЯ ЗМЕНЫ У РЭАКЦЫЯХ МІЖНАРОДНЫХ СТРУКТУР, ЯКІЯ ТЫЧАЦЦА СІТУАЦЫІ З ПРАВАМІ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ

ГАЛОЎНАЕ:

- Літва ініцыявала разбіральніцтва ў дачыненні Беларусі ў Міжнародным Судзе ААН у сувязі з міграцыйным крызісам.

## ІСК ЛІТВЫ СУПРАЦЬ БЕЛАРУСІ Ў СУВЯЗІ З МІГРАЦЫЙНЫМ КРЫЗІСАМ

У працяг сітуацыі з міграцыйным крызісам, арганізаваным беларускімі ўладамі, 19 мая 2025 г. Літва ініцыявала ў Міжнародным судзе ААН разбіральніцтва супраць Беларусі, сцвярджаючы, што апошняя парушыла свае абавязальніцтвы па пратаколе супраць незаконнага ўвозу мігрантаў па сушы, моры і паветры, які дапаўняе Канвенцыю ААН супраць транснацыянальнай арганізаванай злачыннасці.

Па сцверджанні Літвы, Беларусь парушыла артыкулы 10, 11, 12, 15 і 16 Пратакола, у прыватнасці:

- спрыяючы, падтрымліваючы і забяспечваючы незаконны ўвоз мігрантаў, а таксама не прыняўшы неабходных мер на мяжы для прадухілення і выяўлення такога ўвозу і забеспячэння бяспекі і кантролю дакументаў;

- не ажыццявіўшы абмен інфармацыяй для прадухілення, выяўлення і расследавання незаконнага ўвозу мігрантаў, не ўзмацніўшы супрацоўніцтва з літоўскімі памежнымі органамі і не наладзіўшы ўзаемадзеяння ў сферы публічнага інфармавання, накіраванага на прадухіленне таго, каб патэнцыйныя мігранты станавіліся ахвярамі арганізаваных злачынных груповак;

- не забяспечыўшы абарону правоз мігрантаў і аказанне ім адпаведнай дапамогі.

Беларусь выявіла намер пярэчыць супраць наяўнасці юрысдыкцыі Суда і прымальнасці звароту Літвы. Міжнародны суд устанавіў крайнія тэрміны для абмену дакументамі: Беларусь павінна прадставіць свой мемарандум да 19 студзеня 2026 г., а Літва контрмемарандум – да 20 ліпеня 2026 г.

## СТВАРЭННЕ ТРЫБУНАЛА ПА АГРЭСІІ СУПРАЦЬ УКРАІНЫ З МАГЧЫМАСЦЮ ЗАКЛІКАЦЬ ДА АДКАЗНАСЦІ БЕЛАРУСКІХ СЛУЖБОВЫХ АСОБАЎ

24 чэрвеня прэзідэнт Украіны Уладзімі Зяленскі і генеральны сакратар Савета Еўропы (СЕ) Ален Берсэ падпісалі Пагадненне пра стварэнне Спецыяльнага трыбунала па зрачынстве агрэсіі супраць Украіны.

Патрэба ў асобным органе для прыцягнення вінаватых да адказнасці за поўнамаштабнае ўварванне Расеі ва Украіну, якое можна кваліфікаваць як злачынства агрэсіі ў адпаведнасці з Рымскім статутам, абумоўленая юрысдыкцыйнымі абмежаваннямі Міжнароднага крымінальнага суда. Асаблівы юрысдыкцыйны рэжым для злачынстваў агрэсіі ў дадзеным выпадку патрабуе, між іншага, ратыфікацыю Рымскага статута і Расіяй (якая не з'яўляецца стараной бокам гэтай дамовы), і Украінай – альбо перадачы сітуацыі Саветам Бяспекі ААН, што ў гэтым выпадку фактычна блакуецца правам вета Расіі.

Юрысдыкцыя новага трыбунала заснаваная на тэрытарыяльнай тэрытарыяльнай юрысдыкцыі Украіны - суверэнным праве апошняй ажыццяўляць крымінальны пераслед за злачынства агрэсіі ў дачыненні да сябе, якое яна дэлегуе на міжнародны ўзровень. Установа Трыбунала адбываецца ў рамках Савета Еўропы праз механізм пашыранага частковага пагаднення, да якога змогуць далучацца не толькі дзяржавы – члены СЕ, але і іншыя дзяржавы і ЕЗ.

Прадметная юрысдыкцыя Трыбунала абмежаваная расследаваннем і пераследам выключна злачынства агрэсіі супраць Украіны; кола асоб, якія могуць быць прыцягнутыя да адказнасці – вышэйшае палітычнае і ваеннае кіраўніцтва, адказнае за планаванне, падбухторванне, ініцыяванне, ажыццяўленне або спробу ажыццяўлення агрэсіі.[3] Фармулёўкі Статута дапускаюць патэнцыйны пераслед і ў дачыненні да службовых асоб Беларусі пры наяўнасці доказаў іх істотнага ўкладу ў злачынства агрэсіі.

---

3 *Гл. арт. 4(1) Устава: «Асоба, якая займае пасаду, што дазваляе фактычна ажыццяўляць кантроль над палітычнымі або ваеннымі дзеяннямі дзяржавы альбо накіроўваць іх, якая планавала, падбухторвала, аддавала загад, здзейсніла альбо спрабавала здзейсніць злачынства, названае ў артыкуле 2 гэтага Статута, нясе індывідуальную адказнасць за гэтае злачынства».*

Еўрапейскі парламент, заклікаючы інстытуты ЕЗ і дзяржавы-члены да стварэння асобнага трыбунала, адзначаў, што такі орган «мусіць мець юрысдыкцыю расследаваць не толькі дзеянні Уладзіміра Пуціна і палітычнага і ваеннага кіраўніцтва Расійскай федэрацыі, але і Аляксандра Лукашэнкі і палітычнага і ваеннага кіраўніцтва Беларусі як дзяржавы, з тэрыторыі якой і пры лагістычнай падтрымцы якой Расійская федэрацыя вядзе агрэсізную вайну супраць Украіны, што трапляе пад вызначэнне злачынства агрэсіі адпаведна артыкулу 8 bis Рымскага статута».

Важна таксама адзначыць, што Трыбунал прытрымліваецца агульных міжнародна-прававых абмежаванняў у дачыненні да асабістых імунітэтаў вышэйшых службовых асоб - дзеючых кіраўнікоў дзяржаў, кіраўнікоў урадаў і міністраў замежных спраў. Такія асобы могуць быць адданыя суду толькі, калі яны больш не знаходзяцца ва ўладзе — або іх імунітэт будзе зняты. Тым не менш стварэнне Трыбунала ўжо цяпер стварае магчымасць для правядзення расследаванняў, збору доказаў і падрыхтоўкі абвінавачванняў; сам жа Трыбунал будзе гатовы ажыццявіць пераслед і прыцягнуць вінаватых да адказнасці, як толькі гэта стане магчымым.

**МЫ БУДЗЕМ УДЗЯЧНЫ ЗА**

**ЗВАРОТНУЮ СУВЯЗЬ !**

ПІШЫЦЕ НАМ НА OFFICE@BELHELCOM.ORG